# § 34. Асноўныя тэндэнцыі сацыяльна-эканамічнага развіцця цывілізацый свету

**БУРЖУАЗІЯ АГАРОДЖВАННІ
КАПІТАЛ КАПІТАЛІЗМ
МАНУФАКТУРА КАЛОНІЯ
МЕТРАПОЛІЯ ПРАЛЕТАРЫЯТ
ПРАМЫСЛОВАЯ РЭВАЛЮЦЫЯ
ПРАТЭКЦЫЯНІЗМ
АГРАРНЫ ПЕРАВАРОТ**

**1. Асаблівасці эканамічнага развіцця і сацыяльных адносін ва ўсходніх і заходніх цывілізацыях.** У XVI–XVIII стст. найважнейшай тэндэнцыяй грамадскага развіцця ў Заходняй Еўропе было фарміраванне **капіталізму**. Адметнымі яго рысамі з’яўляліся ўдасканаленне мануфактурнай, а пазней узнікненне фабрычнай вытворчасці, пашырэнне ўнутранага і знешняга гандлю. Напрыканцы XVIII ст. у Заходняй Еўропе практычна ўся зямля замацавалася ў прыватнай уласнасці і зрабілася аб’ектам куплі-продажу, а яе выкарыстанне ператварылася ў адну з крыніц прыбытку. Прамысловы пераварот і змены ў сельскай гаспадарцы стымулявалі інавацыі і тэхналагічны прагрэс, што, у сваю чаргу, паскорыла эканамічнае развіццё.

Фарміраванне капіталістычных адносін у Заходняй Еўропе

**Капіталізм** — грамадскі лад, заснаваны на прыватнай уласнасці, наёмнай працы і рыначнай эканоміцы.

Паступовы пераход да капіталізму спрыяў узнікненню новых сацыяльных груп: буржуазіі і наёмных рабочых (пралетарыяту). Буржуазія фарміравалася з розных пластоў грамадства, якія здолелі накапіць сродкі: купцоў, ліхвяроў, цэхавых майстроў, заможных сялян. Трансфармаваліся ў буржуазію і «новыя дваране», якія займаліся

прадпрымальніцтвам. У наёмных пераствараліся збяднелыя рамеснікі, дробныя гандляры, сяляне, якія страцілі зямлю.




Успомніце адметныя рысы феадалізму. У чым адрозненне паміж феадалізмам і капіталізмам?

**Асаблівасці эканамічнага развіцця краін Цэнтральнай і Усходняй Еўропы**

Фарміраванне капіталістычнага ўкладу ішло нераўнамерна. У адрозненне ад краін Заходняй Еўропы ў дзяржавах Цэнтральнай і Усходняй Еўропы ў XVI–XVIII стст. капіталізм не атрымаў пашырэння. Тут пераважалі развітыя паншчынна-прыгонніцкія парадкі. Галоўная прычына іх фарміравання — высокі попыт на прадукцыю сельскай гаспадаркі ў Заходняй Еўропе.

У перыяд ранняга Новага часу становішча сялян у Расіі значна пагоршылася. У 1724 г. замест шматлікіх падаткаў быў уведзены падушны падатак, памер якога аказаўся ўдвая большы, чым раней. Гэты падатак пашырыўся не толькі на сялян, але і на гараджан. Прыгоннае права дасягнула сваёй гранічнай формы ў часы Кацярыны II (1762–1796 гг.), калі памешчыкі атрымалі практычна неабмежаваную ўладу над сялянамі: яны маглі іх прадаваць, караць, перадаваць у спадчыну і нават прайграваць у карты. Сялянскія надзелы скарачаліся, адначасо-

ва павялічвалася працягласць паншчыны. Гэтыя фактары сур’ёзна тармазілі эканамічнае развіццё краіны.

Разрыў у тэмпах эканамічнага развіцця паміж Усходам і Захадам

У дзяржавах Усходу ў XVI–XVIII стст. панавалі феадальныя адносіны і нават рэшткі рабаўладальніцкіх, што стрымлівала іх эканамічны і сацыяльны прагрэс. Тут зямля і іншыя рэсурсы заставаліся пад кантролем манархаў або вузкага кола прадстаўнікоў пануючых пластоў грамадства. Гэта абмяжоўвала магчымасці эканамічнага росту, скоўвала прадпрымальніцкую ініцыятыву простых людзей.

Разрыў у тэмпах развіцця Усходу і Захаду, што праявіўся ў пачатку Новага часу, зрабіўся важным фактарам, які вызначыў далейшы ход сусветнай гісторыі і характар геапалітычных адносін паміж найбуйнейшымі дзяржавамі свету.

Умовы фарміравання капіталістычных адносін

**2. Першапачатковае накапленне капіталу.** Адной з умоў складвання капіталістычных адносін у Заходняй Еўропе выступіла з’яўленне прадпрымальнікаў, якія мелі грашовыя сродкі і маглі іх укласці ў арганізацыю нейкай справы. Не менш важнае для капіталізму было фарміраванне рынку свабоднай рабочай сілы ў асобе наёмных работнікаў. Імі рабіліся сяляне, якія страцілі зямлю, і рамеснікі, што пазбавіліся сваіх майстэрняў. Падобныя змены ў сацыяльнай структуры заходнееўрапейскага грамадства з’явіліся ўнутранымі перадумовамі для развіцця капіталістычных адносін. Знешняй перадумовай выступілі Вялікія геаграфічныя адкрыцці. Прыток вялікай колькасці золата і срэбра з калоній дазволіў сабраць першасны капітал, які прадпрымальнікі маглі ўкласці ў пачатак вытворчасці. Такім чынам, у Заходняй Еўропе, у адрозненне ад краін Усходу, склаліся дзве найважнейшыя ўмовы, неабходныя для развіцця капіталізму: магчымасць накаплення капіталу і наяўнасць свабодных рабочых рук.

## КРЫНІЦЫ НАКАПЛЕННЯ КАПІТАЛУ

- Даходы, атрыманыя з гандлёва-ліхвярскай дзейнасці
- Гандлёвыя пошліны з тавараў, якія ўвозяцца і вывозяцца
- Дзяржаўныя пазыкі
- Палітыка пратэкцыянізму
- Гандаль рабамі
- Рабаванне калоній

**Асноўныя шляхі накаплення капіталу**

*Першапачатковае накапленне капіталу* — гэта працэс, у ходзе якога будучыя вытворцы збіраюць матэрыяльныя і фінансавыя рэсурсы *(капітал)*, неабходныя для адкрыцця і развіцця сваёй справы. Укладзены капітал павінен быў прыносіць сталы прыбытак. Аднак разбагацелыя прадпрымальнікі не заўсёды ўкладвалі свае накапленні ў развіццё вытворчасці. Некаторыя лічылі за лепшае захоўваць іх у выглядзе скарбаў, выдаткоўваць на пацехі. Такім чынам, першапачатковае накапленне капіталу не заўсёды пераходзіла ў інвеставанне прадпрымальніцкай справы — вытворчасці, фінансаў або гандлю.

Капіталізм хутчэй развіваўся ў пратэстанцкіх краінах. Гэтаму спрыяла ідэалогія Рэфармацыі, якая прызнавала легітымнасць багаццяў і накапленняў, здабытых уласнай працай.

Зацікаўленым бокам развіцця капіталістычных адносін была дзяржава, якая выкарыстоўвала розныя меры, што спрыялі накапленню капіталу, — узаконьвала абеззямельванне сялян, павялічвала падаткі, заахвочвала рабаўніцтва калоній і гандаль рабамі. Вялікую ролю ў эканоміцы адыгрываў *пратэкцыянізм* (палітыка, накіраваная на абарону і стымуляцыю вытворчасці шляхам абмежавання ўвозу ў краіну прадукцыі з іншых дзяржаў).

Працэс першапачатковага накаплення капіталу адбываўся ва ўсіх заходнееўрапейскіх краінах, але раней за ўсё — у канцы XV ст. — ён пачаўся ў Англіі. Тут «новыя дваране» актыўна ўцягваліся ў гандаль і прадпрымальніцтва. Яны пачалі выкарыстоўваць тэрыторыю сваіх уладанняў пад пашы для авечак, зганяючы сялян з зямлі, якую тыя апрацоўвалі *(агароджванне)*. Ва ўмовах павышанага попыту на воўну яе вытворчасць прыносіла куды больш прыбытку, чым земляробства і сялянскія плацяжы. Беззямельныя сяляне папаўнялі армію беспрацоўных, што забяспечвала прадпрымальнікаў і землеўладальнікаў таннай рабочай сілай.

У англійскім парламенце, у палаце лордаў, перад каралеўскім тронам стаіць чырвоны пуф, набіты воўнай (woolsack — мяшок з воўнай). На ім сядзіць старшыня палаты — лорд-спікер. Даведайцеся, з чым звязаная гэтая традыцыя.

### ПРАЦУЕМ З ГІСТАРЫЧНАЙ КРЫНІЦАЙ

**З «Утопіі» Томаса Мора**

Вашы авечкі… звычайна такія рахманыя… кажуць, сталі такія ненажэрныя і нястрымныя, што паядаюць нават людзей, спусташаюць палі, дамы і гарады. Менавіта ва ўсіх тых частках каралеўства, дзе здабываецца самая тонкая і таму самая каштоўная воўна, знатныя арыстакраты і нават некаторыя абаты, людзі святыя… не пакідаюць нічога для раллі, адводзяць усё пад пашы, руйнуюць дамы, разбураюць гарады, робяць з храмаў свіныя катухі. Гэтыя мілыя людзі ператвараюць у пустыню ўсе паселішчы і кожную пядзю апрацаванай зямлі.

1. *Укажыце назву працэсу, апісанага аўтарам у гэтым урыўку. У якой краіне ён меў месца і чаму?*
2. *Як Томас Мор ставіўся да такога працэсу?*
3. *Што меў на ўвазе аўтар, выкарыстоўваючы выраз «авечкі паядаюць нават людзей»?*

**3. Аграрны пераварот.** Важным этапам у развіцці капіталізму выступіў аграрны пераварот, або аграрная рэвалюцыя. Яна была шчыльна звязана з глыбокімі зменамі ў сельскай гаспадарцы, эканамічных адносінах і сацыяльнай структуры грамадства.

**Змены ў сельскай гаспадарцы**

Пачынаючы з XV ст. сельская гаспадарка ў Заходняй Еўропе зазнала істотныя змены. Адной з найбольш значных падзей было ўкараненне новых метадаў апрацоўкі зямлі, што павялічвала прадукцыйнасць вясковай працы і давала магчымасць вызваліць частку насельніцтва ад сельскай гаспадаркі для работы на мануфактурнай вытворчасці.

Аграрны пераварот спрыяў пераходу да прыватнай уласнасці на зямлю. Ён суправаджаўся актыўнай прыватызацыяй зямлі і ростам колькасці буйны́х землеўладальнікаў. Гэта прывяло да канцэнтрацыі вясковых зямельных угоддзяў у руках багатых феадалаў і буржуазных прадпрымальнікаў. Валодаючы неабходнымі фінансавымі магчымасцямі, яны ўкаранялі сучасныя метады гаспадарання, што спрыяла росту прадукцыйнасці сельскай гаспадаркі і абагачэнню вышэйшых пластоў грамадства.

Аграрны пераварот таксама забяспечваў рост рынкаў збыту сельскагаспадарчай прадукцыі, што ствярала стымул для дадатковай вытворчасці, спрыяла новаўвядзенням і тэхналагічнаму прагрэсу. Інавацыі, такія як укараненне новых сельскагаспадарчых машын і селекцыя раслін, павышалі эфектыўнасць сельскай гаспадаркі.

Адбыліся значныя змены ў сацыяльнай структуры. Вырасла мабільнасць насельніцтва, многія сяляне і рамеснікі пераехалі ў гарады ў пошуках працы. Гэта прывяло да росту колькасці гарадскіх жыхароў.

Усе вышэйпералічаныя аспекты аграрнага перавароту спрыялі развіццю капіталізму.

**Ад цэхаў да мануфактур**

**4. Рост мануфактурнай вытворчасці.** У пачатку Новага часу ў Еўропе паўсюль захоўвалася цэхавая арганізацыя гарадскога рамяства. Аднак цэхі не маглі задаволіць узрослы попыт на многія віды прамысловай прадукцыі, таму на змену ім прыйшла мануфактурная вытворчасць. Першыя мануфактуры ўзніклі ў Еўропе яшчэ ў XIV ст. у гарадах-дзяржавах Італіі. Пазней яны з'явіліся ў Нідэрландах, Англіі, Францыі і іншых краінах. Іх узнікненне было абумоўлена ростам рамяства і таварнай вытворчасці, з'яўленнем рамесных майстэрань з наёмнымі рабочымі. Важнай

Успомніце, што такое мануфактура. Чым яна адрозніваецца ад рамесніцкай майстэрні?

**ФОРМЫ МАНУФАКТУР**

- **Раскіданая** — Купец-прадпрымальнік раздаваў сыравіну надомнікам-рамеснікам і атрымліваў ад іх гатовы тавар або паўфабрыкат
- **Змешаная** — Спалучэнне выканання асобных аперацый у цэнтралізаванай майстэрні з надомнай працай
- **Цэнтралізаваная** — Прадпрымальнік меў сваю майстэрню, у якой ажыццяўляліся ўсе аперацыі па вытворчасці прадукту

Назавіце моцныя і слабыя бакі кожнай формы мануфактур.



Якая форма мануфактуры прадстаўлена на карціне? Прывядзіце аргументы.

*Англійская мануфактура. XVI ст.*

умовай было таксама павелічэнне грашовых багаццяў у выніку першапачатковага накаплення капіталу. Мануфактурныя прадпрыемствы папярэднічалі буйной машыннай індустрыі і панавалі ў вядучых краінах Заходняй Еўропы да апошняй траціны XVIII ст.

### Развіццё мануфактурнай вытворчасці ў Расіі

Першыя мануфактуры ў Расіі ўзніклі ў XVII ст. На момант заканчэння праўлення Пятра I (1689–1725 гг.) у краіне налічвалася ўжо 221 мануфактура, тады як за ўсё папярэдняе стагоддзе іх было заснавана не больш за тры дзясяткі. Найбольш дынамічна развіваліся металургія і лёгкая прамысловасць.

У Расіі мануфактурная вытворчасць мела свае асаблівасці. Першапачаткова мануфактуры ствараліся дзяржавай і працавалі пераважна на вайсковыя патрэбы. З цягам часу прадпрыемствы пераходзілі ў прыватныя рукі, але дзяржаўны кантроль заставаўся моцным. Галоўнае ж адрозненне ад Заходняй Еўропы заключалася ў арганізацыі працы: расійскія мануфактуры выкарыстоўвалі прымусовую працу прыгонных сялян, а з 1736 г. да іх прымацоўваліся і «работныя людзі», што зрабіліся фактычна паднявольнымі працаўнікамі.

У другой палове XVIII ст. у Расіі назіралася актывізацыя прыватнага прадпрымальніцтва, і сярод

## ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ



Шатландскі эканаміст і філосаф Адам Сміт у першым раздзеле сваёй славутай работы «Доследы аб прыродзе і прычынах багацця народаў» (1776 г.) апісвае невялікую мануфактуру па вырабу шпілек.

«…Адзін цягне дрот, другі выраўноўвае яго, трэці абразае, чацвёрты вострыць канец, пяты абточвае адзін канец, каб насадзіць галоўку; выраб самой галоўкі патрабуе дзвюх або трох самастойных аперацый; насадка яе ўяўляе асобную аперацыю, паліраванне шпількі — іншую; самастойнай аперацыяй з'яўляецца нават загортванне гатовых шпілек у пакуначкі. Такім чынам, складаная работа па вырабе шпількі падзелена прыблізна на васямнаццаць асобных аперацый…».

*1. Як завецца арганізацыя працы, прапанаваная ў апісанні?*

«…Я бачыў адну такую маленькую мануфактуру, дзе працавала толькі 10 рабочых, і таму некаторыя з іх выконвалі, адну за адной, па дзве і па тры аперацыі. Хоць гэтая мануфактура была вельмі бедная і таму недастаткова забяспечана неабходнымі прыладамі, аднак і гэтыя 10 рабочых пры поўнай напрузе сіл паспявалі вырабіць каля 12 фунтаў шпілек за дзень. А паколькі ў кожным фунце звыш 4 тыс. шпілек сярэдняй велічыні, дык, значыцца, гэтыя 10 рабочых паспявалі вырабіць разам больш за 48 тыс. шпілек штодня… Але калі б усе яны працавалі ў адзіночку і незалежна адзін ад аднаго і не былі прывучаны да той спецыяльнай работы, дык, несумненна, ніводзін з іх не мог бы зрабіць дваццаці, а можа, нават і адной шпількі за дзень».

*2. Колькі шпілек за дзень вырабляў адзін рабочы пры такой арганізацыі вытворчасці?*

*3. Палічыце, у колькі разоў павялічылася прадукцыйнасць працы на мануфактуры ў параўнанні з тым, калі ўсю работу па вырабе шпількі выконваў адзін чалавек.*

*4. Назавіце перавагі мануфактурнай вытворчасці.*

уладальнікаў прадпрыемстваў пачалі з'яўляцца былыя сяляне, у тым ліку прыгонныя.

**Асаблівасці прамысловай рэвалюцыі**

**5. Пачатак прамысловага перавароту.** Развіццё мануфактур падрыхтавала тэхнічныя магчымасці для пераходу да машыннай вытворчасці. Першай краінай, дзе ў другой палове XVIII ст. пачаўся прамысловы пераварот, была Вялікабрытанія.

Адным з ключавых элементаў прамысловага пераварату выступіла механізацыя вытворчасці. Вына-

ходства механічных ткацкіх станкоў і паравых машын, іх укараненне дазвалялі ў разы павялічыць прадукцыйнасць працы, паменшыць колькасць аднастайных ручных аперацый.

Для эфектыўнай транспарціроўкі сыравіны і гатовай прадукцыі па ўсёй краіне будавалі дарогі, пракладвалі каналы. Разгалінаваная транспартная сетка паскарала тавараабмен і спрыяла развіццю нацыянальнага рынку. Вынаходствы ў галіне металургіі, хіміі і машынабудаўніцтва палепшылі вытворчыя працэсы і стымулявалі рост эканомікі.

## ТЭХНІЧНЫЯ ПЕРАЎТВАРЭННІ Ў ТЭКСТЫЛЬНАЙ ВЫТВОРЧАСЦІ

**1733 г.** **Джон Кей** вынайшаў «лятучы чаўнок»





**1765 г.** **Джэймс Харгрыўз** сканструяваў механічную калаўротку «Джэні»

**1769 г.** **Рычард Аркрайт** запатэнтаваў прадзільную машыну з гідраўлічным прыводам (ватар-машына)





**1779 г.** **Самуэль Кромптан** сканструяваў «мюль-машыну»

**1784 г.** **Джэймс Уат** запатэнтаваў паравы рухавік «двайнога дзеяння»



Як укараненне тэхнічных новаўвядзенняў паўплывала на развіццё тэкстыльнай вытворчасці?

### Наступствы прамысловай рэвалюцыі

Прамысловы пераварот стымуляваў масавую міграцыю вясковага насельніцтва ў гарады ў пошуках працы на фабрычных прадпрыемствах. За кошт гэтага значна вырастала колькасць гарадскога насельніцтва. Фарміраваліся два асноўныя пласты капіталістычнага грамадства — буржуазія і пралетарыят.

Выкарыстанне машыннай тэхнікі павялічыла разнастайнасць прадукцыі, што выраблялася. Зрабіўся магчымым масавы выраб адзення, абутку, мэблі і іншых тавараў. Аднак гэты працэс быў павольны і паступовы. Умовы жыцця фабрычных людзей былі цяжкія, праца — знясільваючая, а заработная плата — нізкая.

Прамысловая рэвалюцыя паступова пашырылася за межы Вялікабрытаніі. Яна аказала ўплыў на эканоміку і грамадства еўрапейскіх краін, а пазней і астатняга свету.

**6. Захоп кантролю над знешнім гандлем усходніх краін еўрапейцамі.** Падчас Вялікіх геаграфічных адкрыццяў еўрапейцы стварылі гандлёвыя паселішчы і калоніі на ўзбярэжжы Афрыкі, Азіі і Амерыкі. Пабудаваўшы каланіяльныя імперыі, еўрапейцы ўсталявалі кантроль над заморскімі тэрыторыямі і рэсурсамі, што забяспечвала рэгулярныя пастаўкі ў Еўропу разнастайных тавараў і сыравіны.

**Палітыка меркантылізму**

У XVIII ст. адбыўся выбуховы рост прамысловай вытворчасці ў Еўропе, што прывяло да павелічэння аб'ёмаў вытворчасці і экспарту тавараў. У гэты перыяд пануючай эканамічнай ідэалогіяй з'яўляўся *меркантылізм*. Яго прыхільнікі заклікалі да накаплення дзяржавай золата і срэбра шляхам пашырэння экспарту і абмежавання імпарту. Гэтая ідэалогія паўплывала на гандлёвую палітыку многіх еўрапейскіх дзяржаў. Узрасла канкурэнцыя паміж імі за ўсталяванне кантролю над гандлёвымі шляхамі і калоніямі. Супярэчнасці часцяком вырашаліся войнамі і канфліктамі.

У ранні Новы час знешні гандаль стаў неад'емнаю часткай каланіяльнай палітыкі еўрапейскіх дзяржаў, інструментам першапачатковага накаплення капіталу і асновай для росту дабрабыту еўрапейскага грамадства за кошт заморскіх каланіяльных уладанняў.

*Важнай характарыстыкай сацыяльна-эканамічнага развіцця краін Еўропы ў XVI–XVIII стст. было зараджэнне капіталістычнага ўкладу. Істотныя змены адбываліся ў сельскай гаспадарцы і сацыяльнай структуры грамадства, актыўна развіваліся мануфактурная вытворчасць, унутраны і знешні гандаль. У другой палове XVIII ст. у Вялікабрытаніі адбыўся прамысловы пераварот, які адзначыў пераход ад ручной працы да машыннай вытворчасці.*

**калі ў свеце…**

XVI — 70-я гг. XVIII ст. — панаванне мануфактурнай вытворчасці ў краінах Еўропы

**на тэрыторыі Беларусі…**

1720–1730-я гг. — узнікненне мануфактурнай вытворчасці

**ПЫТАННІ І ЗАДАННІ**

1. Растлумачце прычыны разрыву ў тэмпах эканамічнага развіцця паміж краінамі Усходу і Захаду ў XVI–XVIII стст.
2. Запоўніце пропускі ў параўнальнай табліцы «Феадалізм і капіталізм». Зрабіце вывад.

| Параметры для параўнання | Феадалізм | Капіталізм |
|---|---|---|
| Галоўнае багацце | | Капітал |
| Асноўныя сацыяльныя групы | Феадалы і залежныя сяляне | |
| Тып вытворчасці | Пераважае натуральная гаспадарка. Вытворчасць заснаваная на выкарыстанні прымусовай працы | |
| Тэхніка | Прымітыўная | |

3. Якія змены адбыліся ў аграрным сектары эканомікі ў Заходняй Еўропе ў XVI–XVIII стст.? Якое значэнне яны мелі для развіцця Заходняй Еўропы?
4. Запоўніце табліцу «Прамысловы пераварот».

| | Тэхнічныя | Сацыяльна-эканамічныя |
|---|---|---|
| Перадумовы | | |
| Крыніцы | | |
| Наступствы | | |

5. У чым сутнасць палітыкі меркантылізму? Назавіце яе станоўчыя і адмоўныя наступствы.